УДК 94(476.7)

# ПІНСК НА СТАРОНКАХ "БЕЛАРУСКАГА ГІСТАРЫЧНАГА ЧАСОПІСА"

**А.А. Корзюк**
навукова-тэатэрычны, навукова-метадычны часопіс
"Беларускі гістарычны часопіс"
bhc.redaktor2022@gmail.com

**Анатацыя.** У артыкуле разглядаюцца навуковыя матэрыялы, прысвечаныя гісторыі Пінска і Піншчыны, надрукаваныя на старонках "Беларускага гістарычнага часопіса" за гады яго існавання, а таксама публікацыі пінскіх даследчыкаў.

**Ключавыя словы:** Пінск, Пінская зямля, "Беларускі гістарычны часопіс", гісторыя, Палессе

"Беларускі гістарычны часопіс" – адзіны ў краіне штомесячны навукова-тэарэтычны, навукова-метадычны ілюстраваны часопіс па гістарычных і юрыдычных навуках, культуралогіі, мастацтвазнаўстве, методыцы выкладання гісторыі. Выданне выходзіць з 1993 г. (з 2003 г. – штомесяц) і ў сакавіку 2023 г. адзначыць свой 30-гадовы юбілей. Часопіс уключаны ў Пералік навуковых выданняў Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў. У змесце яго шматлікіх рубрык асвятляюцца апошнія дасягненні айчыннай гістарычнай навукі, падаецца беларускі погляд на сусветную гісторыю, прадстаўлены адукацыйныя тэхналогіі XXI стагоддзя і вопыт пазакласнай і краязнаўчай выхаваўчай работы.

Мэта часопіса – рэалізацыя дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі і ідэалогіі. Зыходзячы з гэтага, асноўнымі задачамі выдання з'яўляюцца прапаганда гістарычных ведаў; фарміраванне пачуцця патрыятызму праз вывучэнне гісторыі Беларусі ў кантэксце сусветнай цывілізацыі; павышэнне прафесійнай кампетэнтнасці педагогаў і навуковых кадраў краіны ў галіне гуманітарнай і гістарычнай адукацыі. Таму асноўнай мэтавай аўдыторыяй часопіса з'яўляюцца настаўнікі і выкладчыкі гісторыі, метадысты, краязнаўцы, супрацоўнікі музеяў, студэнты, выкладчыкі вышэйшых навучальных устаноў, аспіранты, магістранты.

За высокі прафесіяналізм, папулярызацыю нацыянальнай гісторыі, выхаванне патрыётаў сваёй Радзімы рэдакцыя часопіса неаднаразова адзначалася Міністэрствам інфармацыі дыпломамі ў нацыянальным конкурсе друкаваных сродкаў масавай інфармацыі "Залатая Літара". У 2011, 2013 гг. – дыпломам лаўрэата за найлепшыя матэрыялы навуковай і навукова-папулярнай тэматыкі, у 2019 г. – дыпломам пераможцы за найлепшыя матэрыялы гісторыка-краязнаўчай тэматыкі.

За час з 1993 па 2022 гг. выйшаў 281 нумар часопіса. На яго старонках сваё адлюстраванне знайшлі шматлікія пытанні палітычнай, сацыяльна-эканамічнай гісторыі, гістарыяграфіі, крыніцазнаўства, гісторыі культуры і адукацыі. Адзначым, што пэўны шэраг з іх прысвечаны гісторыі горада Пінска і Піншчыны. У змесце дадзенага артыкула коратка разгледзім змест найбольш значных з іх, што дасць магчымасць зрабіць выснову аб тых накірунках, якія прыцягвалі ўвагу даследчыкаў.

Адным з першых матэрыялаў, звязаных з Пінскам, з'явіўся допіс Вячаслава Ільенкава "*Свята пісьменнасці і друку ў Пінску*" (№ 4, 1999). У артыкуле даецца інфармацыя аб традыцыйным свяце славянскай пісьменнасці, у якім прынялі ўдзел шырокія колы вучоных, літаратараў, духавенства. На фестывалі былі прадстаўлены найбольш буйныя дзяржаўныя выдавецтвы, адбыліся сустрэчы з вучонымі і журналістамі, а таксама рыцарскі турнір і выступленні мастацкіх калектываў.

У № 1 за 2000 г. быў надрукаваны артыкул выкладчыка Беластоцкага ўніверсітэта, кіраўніка аддзела Польскага гістарычнага таварыства ў Беластоку[11] Яна Ежы Мілеўскага "*Нацыянальная*

[11] Пасады аўтараў артыкулаў падаюцца на год іх апублікавання.

*структура гарадскіх рад у перыяд з 1919 па 1939 г. у Віленскім, Навагрудскім і Палескім ваяводствах*". У яго змесце разглядаецца нацыянальная структура гарадскіх рад у Заходняй Беларусі. Ва ўмовах польскай акупацыі і ў сувязі са значным працэнтам у гарадах яўрэйскага насельніцтва пераважную колькасць месцаў у гарадскіх радах займалі палякі і яўрэі. Аўтар прыйшоў да высновы, што меншае прадстаўніцтва беларусаў было звязанае з невялікай колькасцю беларускай інтэлігенцыі і больш слабым эканамічным становішчам гэтай часткі гарадскога насельніцтва Заходняй Беларусі.

Справаздача аб прайшоўшай Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай палескім мястэчкам, падрыхтаваная Аляксандрам Вабішчэвічам і Сафроніям Жлобам, змешчана ў № 5 за 2001 г. У ёй расказваецца аб ходзе мерапрыемства, у якім прыняло ўдзел каля 90 чалавек. Канферэнцыя насіла полідысцыплінарны характар і вызначыла важнейшыя накірункі вывучэння заяўленай праблематыкі.

У артыкуле дацэнта кафедры культуралогіі і міжнароднага турызму Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта Сяргея Новікава "*Асаблівасці ваенна-эканамічнай гісторыі Беларускага Палесся (1941–1944 гг.)*" (№ 4, 2004) чытачу прапаноўваліся новыя матэрыялы з архіваў ФРГ. Іх змест даваў уяўленне аб такіх аспектах германскай акупацыі Беларускага Палесся, як удакладненне існаваўшай перыядызацыі адміністрацыйна-тэрытарыяльнага дзялення Брэсцкай, Пінскай і Палескай абласцей паміж гебітскамісарыятамі рэйхскамісарыята "Украіна". Даваўся аналіз ваенна-эканамічнай дзейнасці гебітскамісарыятаў па вядзенні гаспадаркі на акупаванай тэрыторыі Беларускага Палесся ў 1941–1944 гг.

Дацэнт кафедры філасофіі і гісторыі Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта Анатоль Трафімчык даследаваў *беларуска-украінскае раздзяленне па Брэсцка-Пінскім Палессі* (№ 4, 2006). У артыкуле з адпаведнай назвай разглядалася пытанне аб тэрытарыяльнай прыналежнасці рэгіёну і правядзенне беларуска-украінскай мяжы ў заходняй яе частцы да пачатку Другой сусветнай вайны. Аўтар прыйшоў да высновы аб палітычных каранях гэтай праблемы і дастаткова выразнай акрэсленасці гістарычнай прыналежнасці Берасцейшчыны ў XX ст.

Цікавае даследаванне выкладчыка кафедры дапаможных гістарычных дысцыплін і методыкі выкладання БДПУ Іны Калечыц надрукаванае ў № 7 часопіса за 2008 г. У артыкуле "*Сякера з музея Беларускага Палесся: невядомы эпіграфічны помнік*" даследуецца жалезная сякера XV ст., знойдзеная пад час археалагічных раскопак у Пінску. Артэфакт знаходзіцца ў экспазіцыі музея Беларускага Палесся ў Пінску. Прааналізавыны надпіс на сякеры, які размяшчаецца ў пяць радкоў і чытаецца як фраза "Смотри вор – Кузьмы топор". Падобныя помнікі былі рэдкай з'явай на беларускіх землях. Аўтар робіць выснову, што дадзеная сякера з'яўляецца ўнікальнай рэччу, бо ўтрымлівае разгорнуты надпіс з абазначэннем уладальніка прадмета і пагрозай магчымым злодзеям.

Дацэнт кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў гістарычнага факультэта БДУ Алена Дзянісава ў рамках свайго навуковага даследавання прадставіла на старонках часопіса два артыкулы: "*Гаспадарчая дзейнасць праваслаўных манастыроў Турава-Пінскай епархіі ў другой палове XV – XVII ст.*" і "*Манастыры Турава-Пінскай епархіі ва ўмовах антыўніяцкай барацьбы праваслаўнага насельніцтва ў канцы XVI – XVII ст.*" (№№ 4, 2009 і 4, 2012). У змесце першай з іх на падставе аналізу дакументаў аўтар вызначае маёмасны стан асобных праваслаўных манастыроў Турава-Пінскай епархіі. Адзначаецца, што большасць з іх не мела значнай маёмасці. Аўтарам падкрэсліваецца, што манастыры не распараджаліся сваёй маёмасцю самастойна, і гэта рабіла іх безабароннымі перад рознымі злоўжываннямі патронаў манастыроў і службовых асоб ВКЛ,

У другім артыкуле прасочваецца гісторыя шэрагу манастыроў Турава-Пінскай епархіі – Лешчанскага, Богаяўленскага, Увядзенскага – ва ўмовах супрацьстаяння прыхільнікаў і праціўнікаў уніяцкай царквы.

Артыкул вучонага сакратара Беларускага навукова-даследчага цэнтра электронная дакументацыі Дзмітрыя Віцько "*Пінскі соймік у канцы XVII – XVIII ст.: функцыянаванне і палітычнае жыццё*" (№ 2, 2011) расказвае аб дзейнасці гэтага органа ва ўказаны перыяд. Аўтар адзначае, што на гэты соймік значны ўплыў аказвалі князі Януш Антоній і Міхаіл Сервацый Вішнявецкія. Яны выкарыстоўвалі пінскі соймік для правядзення сваіх палітычных інтарэсаў у Вялікім Княстве Літоўскім.

У артыкуле студэнта гістарычнага факультэта БДУ Антона Лявіцкага “*Адлюстраванне палітычнага развіцця Тураўскага княства ў беларускай гістарыяграфіі*” (№ 1, 2013), выкананага на падставе адпаведнай курсавой працы пад кіраўніцтвам дацэнта С.М. Цемушава, аналізуецца, якім чынам палітычная гісторыя Тураўскай зямлі разглядаласяў працах беларускіх гісторыкаў XIX – XX стст. Аўтар адзначае, што вывучэнне і трактоўка палітычнай гісторыі Турава былі цесна звязаныя з палітычнымі працэсамі і імкненнем гісторыкаў абгрунтаваць гістарычнае права беларускай нацыі на паўднёвыя тэрыторыі Беларусі.

Асобную групу складаюць артыкулы пінскіх даследчыкаў. Сярод іх трэба адзначыць матэрыялы дацэнтаў Руслана Гагуа “*Грунвальдская бітва 1410 года*” (№ 7, 2021) да 600-годдзя гэтай падзеі; Вячаслава Лазіцкага (члена рэдакцыйнай рады часопіса), прысвечаныя разнастайным аспектам навукова-метадычнага абгрунтавання стварэння і сістэмнага прымянення электронных сродкаў навучання па сацыяльна-гуманітарных дысцыплінах (№ 1, 3, 5, 9, 2008; № 4, 2010; № 5, 7, 2012; № 9, 2014; № 1, 6, 2016); дырэктара сярэдняй школы № 12 г. Пінска Леаніда Ярашэвіча (№ 1, 2008).

Такім чынам, на старонках “Беларускага гістарычнага часопіса” за апошнія 20 год знайшлі сваё адлюставанне разнастайныя аспекты гісторыі Пінска і Піншчыны са старажытных часоў да XX ст. Яны прысвечаны палітычным, ваенным, эканамічным, сацыяльным, этнічным, культурным і рэлігійным пытанням, а таксама методыцы выкладання гісторыі. Гэта дазваляе зрабіць выснову аб пэўнай рэпрэзентатыўнасці прадстаўлення гісторыі рэгіёну ў змесце выдання. У той жа час працягвае існаваць вялікі патэнцыял для публікацыі вынікаў навуковых даследаванняў, навукова-папулярных артыкулаў і інфармацыйна-даведачных матэрыялаў, звязаных  з гісторыяй і сучаснасцю горада і раёна